УДК 811.161.3-321

# Грэчаскія элементы ў навукова-тэхнічнай тэрміналогіі беларускай мовы

Савіцкая І.У.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

У працэсе папаўнення беларускай навукова-тэхнічнай тэрміналогіі найбольш пашыраным тыпам пабудовы складаных лексем з'яўляецца мадэль з грэчаскім прэфіксоідам азначальнага характару. Ён уступае ў падпарадкавальную сувязь з другім, апорным кампанентам, які звычайна выражаецца назоўнікам або прыметнікам.

Сярод элементаў, якія паходзяць ад асноў грэчаскіх назоўнікаў, найбольш ужывальнымі з'яўляюцца наступныя: *аэра-* (аэрастатыка), ***гідра-*** (гідраакумуляцыя), ***фота-*** (фотаэфект), ***электра-*** (электрамагнетызм), ***тэхна-*** (тэхнасфера), ***дынама-*** (дынама-машына), ***амфі-*** (амфітэатр).

Адпрыметнікавыя элементы грэчаскага паходжання, як і адназоўнікавыя, таксама знаходзяцца ў падпарадкавальнай сувязі з назоўнікамі (пераважна запазычанымі): *іза-* (ізаамплітуда), ***магніта-*** (магнітаоптыка), ***макра-*** (макрамалекула), *мега-* (мегацыкл), ***мікра-*** (мікраампер), ***неа-*** (неабарока), ***стэрэа-*** (стэрэаэфект), ***сінхра-*** (сінхрагенератар).

Тэрмінаўтваральны патэнцыял маюць і элементы, якія паходзяць ад асноў грэчаскіх займеннікаў, лічэбнікаў, дзеясловаў, прыслоўяў, прыназоўнікаў, але яны, у параўнанні з адназоўнікавымі і адпрыметнікавымі элементамі, ужываюцца значна радзей. Сярод іх у навукова-тэхнічнай тэрміналогіі сустракаюцца наступныя: *аўта-* (аўтарэгуляцыя), ***мета-*** (метагалактыка), ***мона-*** (монакрышталь), *тэле-* (тэлекамунікацыя), *графа-* (графастатыка).

У якасці апорнага кампанента ў навукова-тэхнічных тэрмінах з грэчаскімі элементамі звычайна выступаюць назоўнікі. Аб прадуктыўнасці гэтай разнавіднасці тэрмінаўтварэння сведчыць той факт, што названыя элементы часта спалучаюцца з уласнабеларускімі назоўнікамі: *аўта*зварка, *аэра*здымка, *гадра*ўстаноўка, *мікра*рухавік, *фота*адбітак, *электра*зварка.

Прыметнікі ў якасці апорнага слова выкарыстоўваюцца значна радзей, што тлумачыцца больш вузкім выкарыстаннем прыметнікавай тэрміналогіі: *агра*прамысловы, *аўта*электронны, *бія*тэрмічны, *механа*зборачны.

Сустракаюцца ў беларускай навукова-тэхнічнай тэрміналогіі і складаныя лексемы, у якіх, акрамя грэчаскіх элементаў, у якасці апорных выступаюць таксама словы грэчаскага паходжання. Найбольш ужывальныя ў такіх тэрмінах наступныя апорныя кампаненты: ***-грама*** (бараграма), ***-граф*** (сейсмограф), ***-літ*** (крыяліт), ***-метрыя*** (графаметрыя), ***-скоп*** (кінетаскоп), ***-дром*** (цыкладром).